**УДК 397**

# ЭТНІЧНЫЯ ГРУПЫ АРШАНШЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧ. XX СТ.: САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

***І. У. ГЛІНСКІ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Артыкул дае агляд на сацыяльна-дэмаграфічны склад этнічных груп Аршаншчыны ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Разглядаецца дынаміка павялічэння этнічных груп па гадах і па паветах, таксама даецца адказ на пытанне, дзе больш сканцэнтравана та або іншая этнічная група ў межах даследаваннай тэрыторыі.*

Сучаснае вывучэнне этнічных супольнасцей Беларусі мае сваю адметную спецыфіку, дзе ў першую чаргу ўвага надаецца беларусам, як тытульнай нацыі. Аднак сучасныя дзяржавы ў большасці з'яўляюцца шматнацыянальнымі і вывучэнне іх этнакультырных асаблівасцей патрабуе і разгляд этнічных груп. У артыкуле прадстаўлена сацыяльна-дэмаграфічная характарыстыка этнічных груп Аршаншчыны. Пад Аршаншчынай разумеецца тэрыторыя сучаснага Аршанскага раёна (у другой палове XIX – пач. XX ст. гэта тэрыторыі Аршанскага, Сенненскага, Копыскага і Горацкага паветаў).

Першыя, адносна дакладныя, звесткі пра колькасць прадстаўнікоў розных этнічных груп, якія жывуць на тэрыторыі Аршанчыны, з’яўляюцца толькі ў XIX стагоддзі. Інфармацыю пра колькасць і дынаміку габрэйскага, польскага і стараверскага насельніцтва па паветах і гарадах можна знайсці ў шэрагу выданняў “Памятных книжках Могилевской губернии” і “Обзорах Могилевской губернии”, а таксама ў “Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 года”. Так, напрыклад, вядома, што ў 1853 годзе ў Аршанскім павеце пражывала ўсяго 110 285 чалавек. Сярод іх палякі складалі 6,53%(7197 чал.), а габрэяў – 11,06%(12195 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва. Сенненскі павет налічваў 53 035 чалавек, сярод якіх палякаў было 8,22%(4359 чал.), а габрэяў – 2,83%(1501 чал.). А ў Копыскім павеце было 64427 чалавек, дзе палякі складалі 6,86%(4420 чал.), а габрэі – 10,17%(6461 чал.) мясцовага насельніцтва [2, с. 60].

У 1861 годзе Аршанскі павет налічваў 111 576 чалавек. Палякі складалі 3,83%(4274 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 6,05%(379 чал.) гарадскога насельніцтва, габрэі – 14,54%(16221 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 58,57%(3669 чал.) гарадскога насельніцтва. Таксама ў павеце былі старaверы, але іх агульная колькасць была ўсяго 15 чалавек і іх колькасць доўгі час будзе вельмі неістотна павялічвацца і ніколі не будзе вышэй нават 1% насельніцтва павета. Сенненскі павет меў 64 703 чалавека. Палякі складалі 6,32%(4087 чал.) ад колькасці агульнага насельніцтва павета і 14,31%(324 чал.) гарадскога насельніцтва, габрэі – 4,33%(2804 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 64,8% гарадскога насельніцтва. Трэба адзначыць, што Сенненскі павет быў месцам з большай канцэнтрацыяй стараверaў на Аршаншчыне, у павеце яны складалі 1,64%(1064 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва. Копыскі павет налічваў 65 742 чалавека. Палякі складалі 6,31%(4149 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 3,41%(105 чал.) гарадскога насельніцтва, габрэі – 13,48%(8859 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 56,57%(1743 чал.) гарадскога насельніцтва. Таксама былі і стараверы, але ў павеце іх было ўсяго 289 чалавек [3, с. 298-301].

У 1863 годзе назіраюцца змены адносна колькасці палякаў. Так, у Аршанскім павеце было 118 191 чалавек, дзе палякі складалі 2,04%(2417 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павет, што амаль у два разы меньш, чым у 1861 годзе. Габрэі складалі 18,35%(21692 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Стараверaў было ўсяго 280 чалавек у павеце. Сенненскі павет налічваў 65 825 чалавек. Палякі складалі 4,96%(3268 чал.) мясцовага уезднага насельніцтва, а габрэі – 5,08%(3345 чал.) Стараверaў жа налічвалася 1,63%(1071 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Копыскі павет меў 65 861 жыхароў. Палякі складалі 8,38%(5516 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета, а габрэі – 13,88%(9140 чал.). Стараверaў пражывала ў павеце ўсяго 20 чалавек [4, с. 290-292].

Па стане на 1889 год, у Аршанскім павеце пражывала 122 851 чалавек. Палякі складалі 4,6%(5656 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 6,34%(556 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 11,57%(14215 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 50,32%(6781 чал.) гарадскога насельніцтва. У Сенненскім павеце было 126 588 чалавек. Палякі складалі 4,61%(5831 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 9,34%(308 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 8,38%(10605 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 63,11%(2082 чал.) гарадскога насельніцтва. А стараверы складалі 2,46%(3111 чал.) ад агульна колькасці насельніцтва павета. Такія змены ў колькасці насельніцтва абумоўлены ліквідацыяй Копыскага павета і ўтварэннем Горацкага. Тэрыторыі былога Копыскага павета былі размеркаваны паміж Аршанскім, Сеннескім і Горацкім паветамі, а сам горад Копысь ўваходзіў у Горацкі павет. Горацкі павет налічваў 95 200 чалавек. Палякі складалі 3,34%

(3176 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 0,69%(68 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 14%(13328 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 51,1%(5035 чал.) гарадскога насельніцтва. А стараверы ўвогуле адсутнічалі на тэрыторыі павета [5, с. 84].

Праз 4 года, у 1893 годзе Аршанскі павет налічваў 134 794 чалавек. Палякі складалі 5,54%(7474 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 4,19%(317 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 12,15%(16372 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 51,22%(3873 чал.) гарадскога насельніцтва. У Сенненскім павеце пражывала 141 490 чалавек. Палякі складалі 5,49%(7773 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 5,03%(300 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 7,8%(11036 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 36,01%(2146 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,43%(3433 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Горацкі павет меў 102 638 жыхароў. Палякі складалі 3,45%(3537 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 0,68%(70 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 15,53%(15937 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 51,1%(5271 чал.) гарадскога насельніцтва[6, с. 385-386].

Згодна з "Памятной книжкой Могилевской губернии", у 1897 годзе ў Аршанскім павеце пражывала 190 618 чалавек. Палякі складалі 4,54%(8663 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 4,24%(611 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 12,62%(24049 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 50,85%(7324 чал.) гарадскога насельніцтва. Але, згодна з "Первой всеобщей переписи населения Российской губернии 1897 года", колькасць чалавек у Аршанскім павеце, якія выбралі польскую мову, як родную, налічваецца 3348 чалавек, а 22715 чалавек выбралі габрэйскую мову, як родную. Сенненскі павет налічваў 164 618 чалавека. Палякі складалі 5,77%(9493 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 3,44%(455 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 8,68%(14291 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 51,23%(6781 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,55%(4190 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. А колькасць чалавек, якія выбралі польскую мову, як родную, налічваецца 3823, а габрэйскую – 12544 чалавека. У Горацкім павеце было 121 112 чалавек. Палякі складалі 3,76%(4548 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,22%(119 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 12,58%(15233 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 45,86%(4458 чал.) гарадскога насельніцтва. Зразумела, што не можа быць адзінага крытэрыя для вызначэння прадстаўніка этнічнай групы, таму вызначэнне па рэлігіі ці роднай мове не можа даць дакладны адказ на пытанне аб колькасці той або іншай этнічнай групы і, менавіта, па гэтай прычыне звесткі не супадаюць [12, с. 116-123].

У 1900 годзе ў Аршанскім павеце пастаянна знаходзілася 200 335 чалавек. Палякі складалі 4,57%(9163 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 4,38%(662 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 12,64%(25325 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 47,05%(7118 чал.) гарадскога насельніцтва. Сенненскі павет налічваў 176 929 чалавек. Палякі складалі 6,09%(10783 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 10,8%(458 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 8,11%(14355 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 51,56%(2186 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,48%(4383 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. У Горацкім павеце было 131 021 чалавека. Палякі складалі 3,79%(4967 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,22%(129 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,63%(17860 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 45,32%(4773 чал.) гарадскога насельніцтва [7, с. 552].

Па дадзенных на 1905 год, Аршанскі павет налічваў 206 692 чалавек. Палякі складалі 5,06%(10459 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 5,28%(865 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 10,96%(22661 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 49,31%(8080 чал.) гарадскога насельніцтва. У Сенненскім павеце пражывала 193 348 чалавек. Палякі складалі 5,17%(10001 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 9,32%(407 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 8,76%(16942 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 54,06%(2361 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,53%(4889 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Горацкі павет налічваў 142 396 чалавек. Палякі складалі 6,82%(9712 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,05%(118 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,85%(19726 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 44,72%(5030 чал.) гарадскога насельніцтва [8, с. 598-599].

Праз 2 гады агульная колькасць насельнітва ў Аршанскім павеце ў 1907 годзе – 218 618 чалавека. Палякі складалі 5,13%(11223 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 5,48%(1008 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 12,81%(27997 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 54,88%(10150 чал.) гарадскога насельніцтва. Сенненскі павет меў 211 354 жыхароў. Палякі складалі 2,38%(5022 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 8,33%(435 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 7,95%(16081 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 58,22%(3041 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,44%(5158 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Горацкі павет налічваў 145 335 чалавек. Палякі складалі 7,13%(10358 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,09%(143 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,89%(20188 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 42,7%(5609 чал.) гарадскога насельніцтва [9, с. 477-488].

Па стане на 1909 год, Аршанскі павет налічваў 216 741 чалавек. Палякі складалі 4,83%(10472 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 6,34%(1290 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,36%(28956 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 50,47%(10272 чал.) гарадскога насельніцтва. У Сеннескім павеце пражывала 220 520 чалавек. Палякі складалі 4,51%(9943 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 6,28%(361 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 9,25%(20405 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 58,23%(3345 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,24%(4942 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. У Горацкім павеце было 155 728 чалавек. Палякі складалі 6,25%(9738 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,17%(156 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 14,54%(22637 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 43,08%(5722 чал.) гарадскога насельніцтва [10, с. 310-311].

У 1912 годзе Аршанскі павет налічваў 229 574 чалавек. Палякі складалі 4,94%(11351 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 5,72%(1318 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,44%(30850 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 52,18%(12019 чал.) гарадскога насельніцтва. У Сенненскім павеце пражывала 230 771 чалавек. Палякі складалі 4,77%(11013 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 4,52%(365 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 9,73%(22446 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 44,94%(3633 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,45%(5654 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Горацкі павет налічваў 161 536 чалавек. Палякі складалі 3,84%(6197 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 0,55%(78 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 15,33%(24759 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 41,27%(5883 чал.) гарадскога насельніцтва [11, с. 265-266].

Згодна з апошнім выданнем "Обзор Могилевской Губернии за 1913 год", у 1913 годзе ў Аршанскім павеце пражывала 235 665 чалавек. Палякі складалі 4,83%(11375 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 5,97%(1490 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 13,29%(31330 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 49,75%(12423 чал.) гарадскога насельніцтва. Старавераў было 635 чалавек, што складае 0,27% ад агульнай колькасці насельніцтва павета. Сенненскі павет налічваў 233 563 чалавек. Палякі складалі 5,11%(11924 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 4,54%(369 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 9,75%(22771 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 44,95%(3652 чал.) гарадскога насельніцтва. Стараверы складалі 2,59%(6050 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва. У Горацкім павеце было 163 375 чалавек. Палякі складалі 4,24%(6925 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 1,05%(153 чал.) гарадскога насельніцтва. Габрэі – 15,37%(25109 чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва павета і 40,87%(5941 чал.) гарадскога насельніцтва [1, с. 131].

Такім чынам, трэба адзначыць, што большасць прадстаўнікоў розных этнічных груп сканцэнтравана на тэрыторыі Сенненскага павета, а меншасць – на тэрыторыі Горацкага павета. Можна заўважыць, што на Аршаншчыне колькасць палякаў у перыяд з 1853 года па 1863 істотна памяншалася, але пасля 1889 года назіраўся стабільны, але нехуткі рост польскага насельніцтва. Так, першапачатковая колькасць палякаў у перыяд з 1853 года па 1915 павялічывалася на 189,18%(14248 чал.). Габрэйскае насельніцтва адзначалася адносна хуткім ростам у перыяд з 1853 да 1915 гады. Гэта пацвярджае першапачатковая колькасць габрэяў, якая ў перыяд з 1853 года да 1915 павялічылася на 392,97%(59053 чал.). Колькасць старавераў у перыяд з 1861 года па 1915 стабільна павялічывалася. Так, першапачатковая колькасць старавераў у перыяд з 1861 года па 1915 павялічылася на 487,96%(5315 чал.), што, у сваю чаргу, робіць іх рост самым хуткім з усіх этнічных груп.

## ЛІТАРАТУРА

1. Обзор Могилевской губернии за 1913 год / Могилев. губ. стат. комитет. – Могилев на Днепре – 1915. – 137 с.
2. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1853 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1853 г. – 147 с.
3. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1861 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1861 г. – 465 с.
4. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1863 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1863 г. – 316 с.
5. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1890 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1890 г. – 459 с.
6. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1893 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1893 г. – 538 с.
7. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1902 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1902 г. – 685 с.

8. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1905 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1905 г. – 756 с.
9. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1909 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1909 г. – 634 с.
10. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1911 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1911 г. – 358 с.
11. Памятная книжка Могилёвской губернии за 1914 год. – Могилев: Типография Губернского Правления, 1914 г. – 561 с.
12. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Могилевская губерния / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1903. – 276 с.